# АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ І ПРЫЁМЫ ЛЕКСІЧНАЙ ПРАЦЫ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

Панятоўская Лізавета Дзмітрыеўна
УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

Удасканаленне сістэмы пачатковай адукацыі накіравана на вырашэнне шэрагу найважнейшых задач, сярод якіх варта асобна вылучыць стварэнне трывалага падмурка для наступнага навучання ў сярэднім звяне. Гэта прадугледжвае не толькі засваенне малодшымі школьнікамі сістэмы апорных ведаў і ўменняў, але і перш за ўсё іх паспяховае ўключэнне ў вучэбную дзейнасць, станаўленне вучэбнай самастойнасці. На ўроках беларускай мовы вучні атрымліваюць як моўныя, так і пазамоўныя веды. Веды аб мове вучні набываюцьу працэсе вывучэння беларускай мовы і разам з гэтым яны папаўняюць свой слоўнікавы запас, засвойваюць лінгвістычную тэрміналогію. Пазамоўныя (экстралінгвістычная) веды (аб навакольным свеце) на ўроках беларускай мовы чэрпаюць часткова з тэкстаў практыкаванняў, а таксама ў выніку знаёмства з творамі літаратуры, пры наведванні тэатраў, музеяў, вытворчых аб’ектаў і г.д., дзе яны разам з новымі ведамі засвойваюць новыя словы.У слоўніка – засваенне новых, раней невядомых вучням слоў, а таксама новых значэнняў тых слоў, якія ўжо маюцца ў іх слоўнікавым запасе. Задача настаўніка – выкарыстоўваць новыя словы  ў навучальным працэсе пры вывучэнні граматыкі і ў працы па развіцці маўлення школьнікаў. Веды аб навакольным свеце, як вядома, папаўняюцца пры вывучэнні ўсіх вучэбных прадметаў, таму важнай крыніцай пашырэння слоўнікавага запасу на ўроках беларускай мовы з’уляецца выкарыстанне міжпрадметнага вучэбна-дыдактычнага матэрыялу, які бывае пазакантэкстным і кантэкстным. У першым выпадку выкарыстоўваюцца асобныя словы або тэматычныя групы слоў, словазлучэнні, сказы, якія адлюстроўваюць змест таго ці іншага школьнага прадмета, у другім – тэксты, якія змяшчаюць асобныя звесткі з іншых школьных прадметаў. Слоўнікавая праца ў школе – галіна методыкі якая ахоплівае засваенне вучнямі новых слоў і іх значэнняў, адценняў значэнняў, эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбоўкі слоў, сфер іх ужывання,мнагазначнасць, засваенне сінонімаў, антонімаў, паронімаў, амонімаў, актывізацыю слоўніка, гэта значыць, выкарыстанне новых засвоеных слоў ва ўласных выказваннях, уключэнне іх у свой слоўнік, ачышчэнне слоўніка ад дыялектных, прастамоўных, вульгарных слоў. Слоўнікавая работа ў школе ўключае ў сябе чатыры напрамкі: узбагачэнне слоўніка, удакладненне слоўніка, актывізацыя слоўніка, працу па ачышчэнні слоўніка ад нелітаратурных слоў. Усе напрамкі слоўнікавай работы вядуцца ў пачатковых класах толькі на практычнай аснове,

галоўным чынам з апорай на тэкст, без тэарэтычных звестак і, як правіла, без выкарыстоўвання тэрмінаў. Узбагачэнне слоўніка – засваенне новых, раней невядомых слоў, а таксама новых значэнняў тых слоў, якія ўжо маюцца ў іх слоўнікавым запасе. Гэта дасягаецца з дапамогай дабаўлення да слоўніка вучня штодня 4-6 новых слоўнікавых адзінак. Неабходна ўжо ў пачатковай школе пазнаёміць дзяцей з паняццем «багатая-бедная мова, маўленне», каб больш паслядоўна і прадуктыўна праводзіць працу па ўзбагачэнні мовы вучняў. Для таго, каб найбольш поўна і дакладна выказаць сваю думку, вучань павінен мець дастатковы лексічны запас, таму праца над вусным маўленнем пачыныецца з пашырэння і ўдасканалення слоуніка. Ператварэнне незнаёмага гукакомплекса ў слова-знак, якое праводзіць настаўнік з вучнямі з дапамогай спецыяльных метадычных сродкаў, ёсць яго семантызацыя. Семантызацыя незнаёмых слоў з’яўляецца адной з задач узбагачэння слоўнікавага запасу вучняў, з яе пачынаецца гэты працэс на ўроках па ўсіх школьных дысцыплінах і, безумоўна, на ўроках беларускай  мовы. Семантызацыя слова метадычна выяўляецца ў тлумачэнні настаўнікам лексічнага значэння, замацаванага ў мове за тым ці іншым гукакомплексам. У методыцы выкладання беларускай мовы былі выпрацаваны спецыяльныя метады тлумачання лексічнага значэння асобнага слова. Прыём семантызацыі слова – гэта метад ператварэння незнаёмага гукакомплекса ў слова-знак, г. зн. замацаванне ў свядомасці школьнікаў гучання і значэння ў адзінае цэлае – слова. Прыёмы семантызацыі прызначаны, па-першае, для аб’яднання ў свядомасці вучня слова і рэаліі, у выніку чаго слова ў мове выконвае назыўную функцыю, па-другое, раскрыцця семантычных множнікаў, якія складаюць сэнсавую структуру слова. З улікам гэтых дзвюх функцый прыёмамі семантызацыі з’яўляюцца вызначэнне семантыкі, структурна-семантычная матывацыя, супастаўленне з вядомым вучням словам, нагляднасць, кантэкст. У методыцы беларускай мовы вядома шмат прыёмаў працы над значэннямі новага слова. Выкарыстанне ўсіх прыёмаў забяспечвае разнастайнасць лексічнай працы, а таксама дазваляе ўводзіць новае слова найбольш рацыянальным менавіта для яго спосабам. Разгледзім асноўныя прыёмы, размясціўшы па ступені іх развіваючага патэнцыялу, якія мы выкарыстоўвалі ў эксперыментальнай працы.

1. Словаўтваральны аналіз, на аснове якога высвятляецца значэнне (або адценне значэння) слова. У пачатковых класах звычайна задаецца пытанне: «Ад якога слова ўтворана гэта слова?» або «Чаму так назвалі: падасінавік, ляснік, чарніцы?». Дадзены спосаб тлумачэння слоў дазваляе ажыццяўляць сувязь слоўнікавай працы з правапісам, так як выяўляе карані слоў і спрыяе праверцы ненаціскных галосных, звонкіх і глухіх зычных.

2. Супастаўленне слоў з мэтай выяўлення адрозненняў, для размежавання значэнняў паронімаў: дыпламат – дыпламант, лясны – лясісты.

3. Тлумачэнне значэння праз кантэкст. Чытанне ўрыўка «высвятляе» значэнне слоў; школьнікі лягчэй разумеюць не толькі іх прамое значэнне, але і дарэчнасць ўжывання, спалучальнасць, выразнасць. 4. Уключэнне новага слова ў кантэкст, складзены самімі вучнямі. Заданне з'яўляецца варыянтам папярэдняга. Гэта прыём актывізацыі слоўніка, але ў цяжкіх выпадках ўключэнне ў кантэкст можа зрабіць настаўнік. 5. Высвятленне значэння новага слова па даведачных матэрыялах, г.зн. па зносках і слоўніка ў кнізе для чытання (у асобных выпадках можна карыстацца тлумачальным слоўнікам). 6. Паказ прадмета, малюнка, макета, чучала або дзеяння. Гэта сродак развіцця пазнавальнай актыўнасці школьнікаў залежыць ад ступені самастойнасці прыцягнутых да тлумачэння слоў: калі малюнак, які тлумачыць значэнне слова, дзеці падабралі, намалявалі самі, то іх пазнавальная актыўнасць будзе дастаткова высокая. 7. Спосаб падбору сінонімаў. Гэта адзш з самых універсальных і часта і ўжывальных прыёмаў: цягнік – поезд, смелы – адважны, ісці – крочыць, салдат – воін. 8. Прыём падбору антанімічнай пары: старт-фініш, добра – дрэнна. 9. Разгорнутае апісанне, якое складаецца з групы слоў або з некалькіх сказаў. Дадзены прыём тлумачэння значэнняў слоў каштоўны тым, што ён дазваляе захаваць натуральнасць маўлення. 10. Спосаб лагічнага вызначэння. Гэты прыём нярэдка дапамагае раскрыць значэнне слова праз падвядзенне яго пад бліжэйшы род і выдзяленне відавых прыкмет: крэйсер – «ваенны карабель». Разнастайнасць прыёмаў і павышэнне актыўнасці вучняў у тлумачэнні значэнняў слоў – найважнейшая задача слоўнікавай працы ў пачатковых класах.Неабходна выкарыстоўваць дадзеныя прыёмы семантызацыі ў комплексе. Але гэта не азначае, што кожнае слова варта ўводзіць у слоўнік вучняў на аснове выкарыстання ўсіх прыёмаў. Тут маецца на ўвазе перш за ўсё забеспячэнне разнастайнасці прыёмаў працы, увядзенне новага слова найбольш рацыянальным для яго спосабам.